# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2024 года*

## 11 клас

## Варыянт 1

**Заданне 1.** Прачытайце затранскрыбіраваныя словазлучэнні (пададзены без уліку націску). У графе «**Правільна»** табліцы насупраць правільнай транскрыпцыі пастаўце «плюс» (+), насупраць няправільнай напішыце правільную транскрыпцыю.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Транскрыпцыя | Правільна |
|---|---|
| [б’эз’л’іч_стэрыйатыпаў] | |
| [інжэн’эрнайэ_збудаван’:э] | |
| [з’м’эшаныйа_карэн’чык’і] | |
| [доўүачасовайа_п’эрс’п’эктыва] | |
| [аранжэрэйны_жэн’шэн’] | |
| [з’эрн’эўборачны_аүрэүат] | |

**Заданне 2.** Учытайцеся ўважліва ў фармулёўкі значэнняў мнагазначнага слова ***АДКРЫТЫ***. Запішыце прыклады (сказы або словазлучэнні) для кожнага значэння гэтага слова.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | Значэнне слова | Прыклады |
|---|---|---|
| 1 | Даступны для ўсіх | |
| 2 | Нічым не адгароджаны, не заслонены, свабодны для агляду | |
| 3 | Без покрыву зверху, з бакоў | |
| 4 | Нічым не прыкрыты, аголены | |
| 5 | Не замаскіраваны, не тайны, яўны | |
| 6 | З вялікім выразам | |

**Заданне 3.** Абапіраючыся на прыведзеныя ў левым слупку табліцы дзеясловы, складзіце шэсць фразеалагізмаў, выкарыстоўваючы прапанаваныя ў наступным абзацы словы. Запішыце складзеныя фразеалагізмы ў правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *аброць*, *бочка*, *катрынка*, *на*, *пад*, *панчоха*, *столь*, *сукно*, *у*.

**Заўвага:** назоўнікі трэба ўжыць у форме патрэбнага склону і ліку.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | |
|---|---|---|
| *класці* | ‘плаціць тут жа, не адкладаючы’ | |
| *круціць* | ‘надакучліва гаварыць адно і тое ж’ | |
| *ляжаць* | ‘заставацца без увагі, без нагляду, рэалізацыі’ | |
| *набіваць* | ‘накопліваць, не пускаючы ў абарот, трымаючы дома. Пра грошы’ | |
| *надзяваць* | ‘падпарадкоўваць сваёй волі, стрымліваць, утаймоўваць каго-н.’ | |
| *пляваць* | ‘зусім нічога не рабіць, гультаяваць’ | |

**Заданне 4.** Зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе, – гэта канчатак. Ці ўсе словы маюць канчатак? Ці заўсёды канчатак з’яўляецца матэрыяльна выражаным? Што абазначае паняцце «нулявы канчатак»? І, урэшце, ці ёсць словы, якія маюць два канчаткі? Правільныя адказы на гэтыя пытанні вам трэба ўспомніць для выканання наступнага задання: 1) размяркуйце прапанаваныя словы па асобных слупках табліцы; 2) у кожным слове (дзе гэта магчыма) вызначце канчатак.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Чымсьці, ёю, падвоіць, сціпла, пеня, джаз, сёй-той, пайшоў, восемдзесят, васьмідзясяты, кудысьці, пасляслоўе.*

| **Словы, якія не маюць канчатка** | **Словы з нулявым канчаткам** | **Словы з матэрыяльна выражаным канчаткам** | **Словы з двума канчаткамі (у тым ліку нулявымі)** |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**Заданне 5.** Утварыце ад прапанаваных назоўнікаў адносныя прыметнікі і запішыце іх у табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| **Назоўнік** | **Прыметнік** | **Назоўнік** | **Прыметнік** |
|---|---|---|---|
| *Копысь* | | *Ганцавічы* | |
| *Гарадок* | | *Азярцы* | |
| *Мядзел* | | *Наваельня* | |
| *Радунь* | | *Бягомль* | |
| *Круглае* | | *Корнадзь* | |
| *Высокае* | | *Бердаўка* | |

**Заданне 6.** Значная колькасць маўленчых памылак звязана з дапушчэннем плеаназму, таўталогіі, неразмежаваннем паронімаў. Назавіце тып дапушчаных у сказе памылак. Запішыце выпраўлены варыянт сказа.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | **Сказ** |
|---|---|
| А | Было адзначана, што вакцына ёсць у наяўнасці. |
| Б | Для абітурыентаў 2023 года ўведзены цікавыя новаўвядзенні. |
| В | Ансамбль вельмі добра выконваў песні народнага фальклору. |
| Г | У кожным лагеры для дзяцей падрыхтавалі розныя забаўляльныя і адукацыйныя праграмы. |
| Д | Моладзь ва ўсе часы была дзейснай. |
| Е | Значэнне Беларускай АЭС для забеспячэння энергетычнай бяспекі нашай краіны проста велізарнае. |

| **Сказ** | **Тып памылкі (у выпадку яе наяўнасці)** | **Выпраўлены варыянт** |
|---|---|---|
| А | | |
| Б | | |
| В | | |
| Г | | |
| Д | | |
| Е | | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

К вечеру лисица залегла пообочь телеграфной линии на дне овражка, в густом и высоком островке сухостойного конского щавеля и, свернувшись рыже-палевым комком подле темно-красных густых стеблей, терпеливо дожидалась ночи, нервно прядая ушами, постоянно прислушиваясь к тонкому посвисту ветра в шелестящих мертвых травах. Телеграфные столбы тоже нудно гудели. Лиса, однако, их не боялась. Столбы всегда остаются на месте, они не могут преследовать. *(По Ч. Айтматову.)*

**Заданне 8.** Вызначце і запішыце ў **радку А** жанравую прыналежнасць пазначаных у **радку Б** твораў. У **радку В** запішыце нумары наступных твораў паводле іх жанру.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

1. «Бондар» Змітрака Бядулі
2. «Роднае карэнне» Максіма Гарэцкага
3. «Дзіўная» Міхася Зарэцкага
4. «Пошукі будучыні» Кузьмы Чорнага
5. «На пыльнай дарозе» Кузьмы Чорнага
6. «Дуб-дзядуля» Ядвігіна Ш.
7. «Непаўторная вясна» Івана Шамякіна
8. «На Каляды к сыну» Змітрака Бядулі
9. «Настаўнік чарчэння» Івана Навуменкі
10. «Губаты» Генрыха Далідовіча
11. «Жураўліны крык» Васіля Быкава

| | | | |
|---|---|---|---|
| **А** | | | |
| **Б** | «Літоўскі хутарок» Максіма Гарэцкага | «Людзі на балоце» Івана Мележа | «У палескай глушы» Якуба Коласа |
| **В** | | | |

**Заданне 9.** Запоўніце пропускі ў табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Аўтар | Назва твора | Персанаж | Характарыстыка персанажа |
|---|---|---|---|
| Васіль Быкаў | | | Ён праяўляў «класавую пільнасць»: пісаў даносы на аднавяскоўцаў і пасылаў іх у раённую газету. Па адным такім паклёпніцкім даносе была раскулачана сям'я Ладзімера Багацькі |
| | | Сымон Зяблік | Увасабляе маладое пакаленне. Ён бунтар спачатку стыхійны, а потым ідэйны. Здольны на адчайныя ўчынкі |
| Уладзімір Караткевіч | | | Ён гуляў у захавальніка шляхецкіх традыцый, быццам абараняў сваячніцу. Але на працягу дзеяння твора высвятляецца, што за маскай хаваецца хітры і бязлітасны чалавек, які задумаў загубіць род сваякоў, каб займець іх замак і маёмасць |
| | | Кручкоў | Гэта станавы прыстаў, які бессаромна абірае запалоханых людзей. Палешукі называюць яго «найяснейшая карона» |
| Якуб Колас | | | Дбайны і акуратны гаспадар. Вясёлы і дасціпны жартаўнік, умее прызнаваць памылкі. Добры жыццёвы настаўнік для дзяцей свайго брата. Уласнай сям'і не мае |
| | «Сэрца на далоні» | | Яна пакутуе ад кахання спачатку да доктара, а потым захапляецца яго прыёмным сынам і яшчэ адным маладым чалавекам, які таксама ёй захапляўся і ледзь не загінуў. У фінале рамана дзяўчына на раздарожжы: каго выбраць у спадарожнікі жыцця |

**Заданне 10.** Прачытайце верш і ўважліва разгледзьце карціны. Уявіце сябе рэдактарам альбома, у якім на адной старонцы будуць размешчаны творы розных відаў мастацтва: жывапісу і літаратуры. Падбярыце да верша адну з прапанаваных карцін і прывядзіце тры аргументы ў карысць вашага выбару.

Прыдумайце арыгінальную назву гэтаму альбому і напішыце невялікую анатацыю (да 50 слоў), у якой адлюструйце мэту стварэння альбома, для каго ён прызначаны, «абыграйце» назву альбома.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Помню: маці заўсёды клалася спаць
Толькі пасля таго, як засыналі
І дзеці ў запечку,
І куры на куросаднях,
І косы, заточаныя пад страхой,
І агонь у задымленай печы,
І вілы з памялом у качарэжніку,
І яблыня, загледзеўшыся ў студню,
І аблокі над страхой буслінай,
І палявая дарога,
закалыханая жытам.

Як жа мне сёння заснуць,
Калі, яе прыгадаўшы,
Усё не спіць,
І не спяць мае думы.

*Максім Танк*
*3.I.1972*



Вітольд Бялыніцкі-Біруля «Дача ў садзе» (1930-я гады)

---



Іван Ахрэмчык «Летні дзень» (1951)




Пётр Сергіевіч «Шляхам жыцця» (1934)

***На адной старонцы будуць размешчаны верш Максіма Танка і карціна***

___

***Аргументы для такой прапановы:***

___

___

___

___

***Альбом будзе называцца***

___

***Анатацыя альбома***

___